...ТАРЫІ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Віцебскі пралетары

ГАЗЭТА ГАРКОМУ КП(б)Б, ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ.

№ 143 | Серада, 1 ліпеня 1931 г. | № 143

КОШТ НУМАРУ У ГОРАДЗЕ І ГРАЁНАХ 5 кап.

РЭДАКЦЫЯ: Палац працы, 3 ці паверх, пак 39, 40, 41, 43. Тэлеф. агульны . 2-85, „ рэдактара 1-73, „ сакрат. і х-ры . 73

Падпісная цана ў месяц: Для рабочых, служачых і калгасьнікаў . . — р. 80 к. Для ўстаноў . . . . . 1 „ — „ З дадаткам „Чырвоная Беларусь“: Для рабочых, служачых і калгасьнікаў . . 1 „ — „ Для ўстаноў . . 1 „ 20 „

Плата за абвесткі: За радок нэтыту . . . . . 30 кап. Для іншагародніх . . . . . 40 „ Пры шматразовым друкаваньні скідка ад 30 да 50 проц.

ГОД ВЫДАНЬНЯ 14 ты.

Сход былых чырвонагвардзейцаў і партызан

5-га ліпеня, а шостай гадз. увечары, у памяшканьні гарсавету (пакой 23) адбудзецца агульны сход былых чырвонагвардзейцаў і партызан па вельмі важных пытаньнях.

ГАРСАВЕТ

...УРТАВАНЫМІ ШЭРАГАМІ — НА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВАЎ

...сьцягам шырока разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі мабілізаваць масы на рашучую барацьбу за генэральную лінію партыі, за правядзеньне ленінскай нацпалітыкі, за выкананьне задач ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ

Пастановы пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б і партактыву Віцебску неадкладна давесьці да кожнага партыйца, да кожнага беспартыйнага рабочага

РАШУЧУЮ ПЕРАБУДОВУ ЎСЁЙ ПАРТРАБОТЫ

...танова сходу партактыву па дакладу т. Гея аб рашэньні ЦК і ЦКК КП(б)Б пра становішча і работу віцебскай партарганізацыі

...аўшы даклад тав. **Гея** аб ...е ЦК КП(б)Б і прэзыдыуму ...(б)Б аб становішчы і рабоце ...і гарпартарганізацыі, сход ...ву цалком і поўнасьцю ...гэтую пастанову і лічыць, ...зусім правільна ацэньвае ...аркому і гарКК і станові... партарганізацыі.

...адзначае, што ў пастанове ...К КП(б)Б з усёй яскра... ...аказаны прарывы ў выра...эрагу вузлавых палітычна...чых задач. Гарком ня спра...выкананьнем заданьняў па ...пляну, з перабудовай парт... работы, цэнтр увагі якой ...есены ў цэх, брыгаду, гру...стак.

...адзначае, што ў пастанове ...К КП(б)Б зусім правільна ...лена, што найбольш глыбокі ...арганізацыя мае ў пытань...вядзеньня ленінскай нацпалі...чым сьведчыць наяўнасьць ...іх выпадкаў вялікадзяржаў...ійскага шавінізму, контррэ...інага беларускага нац. дэма...у, антысэмітызму, яўрэй...іншага шавінізму. Пытаньне ...ізацыі, як складаная часткі ...ай нацпалітыкі і барацьба з ...ржаўным расійскім шавініз...алоўнай небясьпекай на дан...ае, гаркомам ня было ўзьніч...алежную палітычную вышыню ...о вузкі дзяляцкі характар. ...рэнна пастаўлена абслугоў...нацменшасьцяў на іх родным

...адзначаныя прарывы арганізацыі ...е таму, што гарком і рад...ектыву і ячэек у рабоце па ...вузлавых пытаньняў праявілі ...істычны самацёк і ня ўзгла...арка растучую актыўнасьць ...к мас, для мабілізацыі на пясьпяховае вырашэньне задач 3 га рашаючага году пяцігодкі.

Прафсаюзная работа не перабудавана ў выніку наяўнасьці апартуністычнага самацёку ў працы кіраўніцтва гарпрафсавету і нездавальняючага парткіраўніцтва прафработай.

Асноўныя прычыны ўсіх гэтых глыбокіх палітычных прарываў выходзяць з таго, што ў арганізацыі ня выкананы неаднаразовыя дырэктывы цэнтральных парторганаў па разгортваньні бальшавіцкай самакрытыкі, як сталага магутнага мэтаду па ўсіх галінах працы сацбудаўніцтва і гарком не адыграў арганізуючай ролі па разгортваньні самакрытыкі, па яе накіраваньні на рашаючыя вучасткі работы і па барацьбе супроць зажымшыкаў самакрытыкі і глушыцеляў рабочай ініцыятывы. Гэтым гаком аб'ектыўна тармазіў разьвіцьцё самакрытыкі, што па сутнасьці зьяўляецца апартуністычнымі адносінамі да ажыцьцяўленьня лёзунгу партыі аб разгортваньні самакрытыкі.

Пастанова бюро гаркому ад 12 га чэрвеня, ня даўшая разгорнутай крытыкі ў галоўным правільна адзначаных у «Зьвязьдзе» памылак і прарываў работы гаркому,—ня спрыяла мабілізацыі партарганізацыі на іх выпраўленьне.

Актыў адзначае зусім недапушчальныя хістаньні з боку рэдакцыі «Віцебскага Пралетарыя», асабліва па асьвятленьні артыкулаў «Зьвязды», чым газэта дэзарыентавала партарганізацыю і рабочую масу, замест іх мабілізацыі на ліквідацыю прарываў і выпраўленьне дапушчаных памылак у рабоце гаркому. З боку гаркому ня было належнага кіраўніцтва работай «Віцебскага Пралетарыя».

ГарКК у галіне выкананьня прамфінпляну, у перабудове масавай работы, у вырашэньні пытаньняў нацпалітыкі, ня справілася з мабілізацыяй мас на выкананьне гэтых задач і не дабілася пералому ў большасьці фабрычна-завадзкіх калектываў, у мабілізацыі ўвагі партарганізацыі на канкрэтных фактах заціску і скрыўленьня самакрытыкі.

Актыў ставіць перад гаркомам і ўсёй партарганізацыяй задачу мабілізаваць усе свае сілы на бальшавіцкае правядзеньне ў жыцьцё рашэньняў ЦК і ЦКК КП(б)Б ад 23 га чэрвеня.

Бюро гаркому і прэзыдыуму гарКК тэрмінова выпрацаваць канкрэтныя практычныя мерапрыемствы па ліквідацыі прарываў у прамфінпляне на 100 проц. акопу партыйцаў і камсамольцаў ударніцтвам і сацспаборніцтвам, па падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі, правільнай арганізацыі працы ў калгасах і саўгасах (поўны пераход на зьдзельшчыну), далейшаму разгортваньню калектывізацыі, згодна пастановы ЦК і ЦКК ад 23 га чэрвеня 1931 г., па перабудове партмасавай працы, ажыцьцяўленьні рашэньняў кастрычнікавага пленуму ЦК КП(б)Б аб нацпалітыцы, карэннай перабудове савецкай і прафсаюзнай работы, каб паставіць яе ў суадпаведнасьць з гаспадарча-палітычнымі задачамі 3 га рашаючага году і забесьпячэньні сапраўднага канкрэтнага кіраўніцтва ўдарніцтвам і сацспаборніцтвам.

Неадкладна дабіцца рашучага пералому ў разгортваньні бальшавіцкай самакрытыкі, ня гледзячы на асобы, даючы бязьлітасны адпор малейшым спробам яе зацiску і накіроўваючы яе супроць апартунізму ўсіх відаў, за выкананьне рашэньняў ЦК і ЦКК КП(б)Б.

Партактыў аб рабоце гарадзкой партарганізацыі

На пленуме гаркому КП(б)Б, разам з актывам,—сэкратар ЦК КП(б)Б т. **Гей** зрабіў даклад аб становішчы **віцебскай партыйнай арганізацыі і рашэньняў аб'яднанага пасяджэньня бюро ЦК і ЦКК КП(б)Б.**

У сваім дакладзе т. **Гей** спыніўся на прарывах у Віцебску: невыкананьне прамфінпляну шэрагам прадпрыемстваў, недастатковае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, якім ахоплена толькі 56 проц. партыйцаў і 45 проц. камсамольцаў, адсутнічаньне вучоту эфэктыўнасьці ўдарніцтва, неперабудова партработы пасьля ліквідацы акругі, буйнейшы прарыў у пытаньні правядзеньня нацпалітыкі і невыкананьне пастановы кастрычнікавага пленуму па нацпалітыцы, неразгортваньне пралетарскай самакрытыкі, я к а я ня стала штодзённым мэтадам барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за правядзеньне ў жыцьцё усіх палітычна-гаспадарчых кампаній партыі і ўраду.—Гарком партыі—кажа т. **Гей**—не стаяў на чале разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі і нават тармазіў яе разгортваньне. У гэтых вялізарнейшых прарывах—кажа т. **Гей**—вінаваты ня толькі **адзін гарком, вінаваты і ўвесь партактыў.**

Пасьля тав. Гея з садакладам выступіў прадстаўнік ЦКК КП(б)Б.

Па дакладах на **працягу двух дзён ішлі ажыўлёныя спрэчкі.** Усе выступаўшыя **адзінадушна ўхвалялі рашэньне аб'яднанага бюро ЦК і ЦКК і цалком да яго далучаліся.**

Т. **Зільбер** (камтрэст) спыніўся на тым, што гарком партыі не заўсёды лічыўся з думкай нізавых арганізацый. У камтрэсьце—кажа ён—пасьля ухаду тав. **Сухаручкіна**—быў вылучан дырэктарам камтрэсту рабочы тав. **Баграновускі**, а г а р к о м прыслаў **Ахрамейка**, зьнятага з пасады дырэктара фабрыкі «Дзьвіна» за апартунізм. У камтрэсьце **Ахрамейка** працягваў сваю лінію, апартуністычна адносячыся да работы і дашоў да поўнага разлажэньня, сыстэматычна п'янствуючы. Аб гэтым некалькі разоў пісалася ў газэце, але гарком на гэта не рэагаваў. Аб паводзінах **Ахрамейка**, яго п'янках і аб тым, што па яго віне некалькі дзён с т а я л і прадпрыемствы, недалі тт. Венээль, Рэзьнікаў і інш. Зараз **Ахрамейка за поўнае разлажэньне партыйным калектывам выключан з партыі.**

Тав. **Пярцоў**. Камсамольская арганізацыя ў горадзе амаль не адчуваецца. Пытаньню нацпалітыкі гарком не ўдзяляў належнай увагі. Гарпрафсавет нічога не зрабіў для забесьпячэньня прадпрыемстваў настаўнікамі па вывучэньні белмовы. Пракуратура Віцебшчыны бязьдзейнічае. На базе Белуціля маецца шкодніцтва. Суд на гэта не рэагуе. Дысцыпліна на прадпрыемствах нездавальняючая і нават маюцца факты, калі партыйцы робяць прагулы. Самакрытыка на прадпрыемствах не разгорнута, не перабудавана і партработа.

Тав. **Цырлін**. З папярэдніх вынікаў правядзеньня праверкі беларусізацыі в і д а ц ь, што рэалюцыя ЦК КП(б)Б зусім правільна характарызуе становішча нацпалітыкі ў Віцебску. Карэнізацыя апарату ідзе вельмі марудна і нездавальняюча. Чыгунка інтэрнацыяналізацыю не праводзіць. Некаторыя нашы кіраўнікі партыйцы—к а ж а т. Цырлін—ня кіруюць, як н а л е ж ы ц ь, апаратам, і аб п р а в я д з е н ь н і беларусізацыі, і ленінскай нацпалітыкі нагогул не клапацяцца.

Тав. **Файнберг**. Гаркому трэба дапамагчы ў яго рабоце. Па правядзеньні веснавой сяўбы і калектывізацыі мы маем дасягненьні. Кіраўніцтва гаркому партыі выкананьнем прамфінпляну было слабае.

Гарком, ня ўмеючы, падбіраў кадры і нават для такой работы, як у гарсавет, гарпрафсавет, рэдакцыю і інш. Газэта «Віцебскі Пралетарыя» пасьля зьмяшчэньня лістоў у «Зьвязьдзе» зусім расьцяралася, не мабілізуючы партыйную арганізацыю вакол лістоў з Віцебску, на найхутчэйшае ліквідаваньне прарываў.

Тав. **Янерсон**. Пытаньню вылучэньства гарком не ўдзяляў дастатковай увагі. Курсамі вылучэнцаў амаль ніхто не кіраваў і ня ўсе работнікі, скончыўшыя гэтыя курсы, былі разьмеркаваны па прызначэньні. Былі выпадкі, калі гарком, не вядучы вучот скончыўшых, накіроўваў іх зноў да варштату.

Тав. **Іванчін**. Пастанова бюро ЦК аб прарывах правільная. У рабоце больш усяго назіраўся самацёк. Падрыхтоўка кадраў у Віцебску знаходзіцца ў дрэнным становішчы, калі камвузы, саўпартшколы і датэрміновыя курсы не ўкамплектаваны. На мясцох аб падрыхтоўцы прапагандыстых не клапацяцца недастатковая ўвага ўдзяляецца наогул падрыхтоўцы партыйных кадраў у Віцебску. Неабходна зараз лепшых камуністых накіраваць у камвуз, у саўпартшколу.

Газэта «Віцебскі пралетары» яшчэ ня стала змагаром за генэральную лінію партыі, за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Яе склад неабходна ўзмацніць вытрымаными партыйцамі. Партвучоба правалена. Гарком, парткалектывы і ячэйкі на мясцох на гэта не рэагавалі.

Тав. **Нетовіч**. Праведзены месячнік беларусізацыі ня даў належных вынікаў. Наогул у Віцебску правядзеньню ленінскай нацыянальнай палітыкі не ўдзялілі належнай увагі. «Віцебскі пралетары» таксама ня вёў штодзённай барацьбы за ленінскую нацыянальную палітыку.

Тав. **Каменштэйн**. Спыніўся на прарывах у выкананьні прамфінпляну на прадпрыемствах і тлумачыў гэта толькі тым, што гарком, гарсавет, гарпрафсавет і партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі на мясцох не пераключыліся на ўдарныя тэмпы і не мабілізавалі рабочых на выкананьне прамфінпляну. Рэалізацыя пазыкі ідзе марудна. На 27 га чэрвеня рэалізавана толькі **на 2.900 тысяч руб.** замест прадугледжаных планам 4.500 тысяч руб. На мясцох на гэта пытаньне не зварочваюць належнай увагі і на большасьці прадпрыемстваў работа ідзе самацёкам.

Тав. **Сасонка**. Гарком партыі стварыў парткалектыў на фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі» толькі тады, калі там ужо работала больш 2-х тысяч чалавек, а па працягу доўгага часу на фабрыцы ня было партыйнай арганізацыі. Паміж парткалектывамі «Сьцяг індустрыялізацыі» і «Прафінтэрн» маюцца недарэчнасьці. Гарком партыі на гэта таксама не рэагаваў.

Лісты з Віцебску ў «Зьвязьдзе» верны і **адзіваюць сапраўднае становішча віцебскай партыйнай арганізацыі.** Далей т. Сасонка спыніўся на кіраўніцтве з боку гаркому нізавымі партыйнымі арганізацыямі. Вельмі часта, прыходзячы ў гарком, няма з кім гаварыць, бо нікога не знаходзіш. Тав. **Чычэраў**—працягвае тав. **Сасонка**,—як кіраўнік партыйнай арганізацыі **ня быў зьвязан з масай** і непасрэдна на прадпрыемствах не знаходзіўся. Гарком партыі несваечасова рэагаваў на факты скажэньня партыйнай лініі, бюракратызму з боку т. Арлова, справа былога старшыні гарсавету т. Ягорава была змазана. На фабрыцы «Прафінтэрн» маюцца значныя прарывы, але зараз партыйныя арганізацыі фабрыкі мабілізуюць усіх рабочых і прарыў будзе ліквідаваны.

Тав. **Вэнзель**. Пастанова ЦК і ЦКК верная. За прарывы адказвае таксама і гарадзкая кантрольная камісія. Наша асноўная памылка заключаецца ў тым, што нашы шматлікія рэзалюцыі не даходзілі да масы. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў горадзе не разгорнута (маецца ўсяго толькі 11 тысяч ударнікаў). Прамфінплян да варштату не даведзен. Гасразрахунак праводзіцца фармальна і наогул партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі Віцебшчыны тварам да вытворчасьці яшчэ не павярнуліся.

Тав. **Бінун** у сваім выступленьні спыняецца на прычынах зрыву прамфінпляну. Асновай невыкананьня галоўнейшых гаспадарчых паказальнікаў—кажа т. Бінун—зьяўляецца адсутнасьць апэрацыйна тэхнічнага кіраўніцтва як з боку парт'ячэек, гэтак і гаспадарнікаў. Прамова т. Сталіна на канфэрэнцыі гаспадарнікаў дастаткова ў гаркоме ня была прапрацавана. Перабудова партыйна-масавай работы, прафсаюзна-тэхнічнай тварам да апэрацыйна-масавых заданьняў ідзе надзвычайна марудна, а ў некатых мясцох фармальна. Гарадзкі камітэт аб тэхнічным кіраўніцтве мала дае казаў і гэтым пытаньнем кіраўніцтва з боку гаркому амаль ня было. Гарком і яго сакратар т. Чычэраў ніколі не знаёміў актыў з працай гаркому. Рашэньні аб'яднанага бюро ЦК і ЦКК КП(б)Б зьяўляюцца зусім правільнымі і яны павінны легчы ў аснову далейшай працы парткалектываў, ячэек і ўсёй партарганізацыі Віцебшчыны.

Тав. **Шафран**. Рашэньні ЦК і ЦКК адносяцца ня толькі да гаркому, але і да бюро парткалектыву, ячэек і ўсяго партыйнага актыву. Фабрыцы «Дзьвіна», дзе больш за ўсё прарыў, гарком зусім мала дапамагаў у ліквідацыі іх. Прычына прарыву на «Дзьвіне» крыецца ў неперабудове партмасавай працы. З наўдворнага боку яна перабудавана, але перабудова праведзена фармальна. Брыгада ЦК, знаходзячаяся на фабрыцы, у значнай ступені дапамагла ў вывучэньні асобных пытаньняў, параджаючых прарывы.

Аб пагражаючым становішчы на «Дзьвіне» добра ведаў гарком. Чымжаён д а п а м а г а ў у працы? Гарком, к і р а ў н і ц т в а яго, нават калі з в а р о ч в а л і с я за парадамі і то не зварочваў належнай увагі. На «Дзьвіне» пытаньне зарплаты стаялаў цэнтры ўсёй увагі. Было нават шкодніцтва ў гэтых адносінах. Аб усім гэтым добра ведаў гарком, але дапамогі аніякай не аказваў. Нават ня было жаданьня ісьці ў гарком, бо ўсё адно ведаеш, што дапамогі ня будзе. Рэзалюцыі ЦК і ЦКК зусім правільна адзначаюць неразгортваньне самакрытыкі ў Віцебску. Бюро гаркому зусім ня спрыяла разгортваньню, тармозячы яе. За тое, што парткалектыў фабрыкі «Дзьвіна» на адным з сваіх пасяджэньняў крытыкаваў работу гаркому, кіраўніцтва гаркому накіравала ўвесь агонь на сакратара калектыву, які «адважыўся» сказаць аб членах бюро гаркому. Парткалектыў «Дзьвіны» цалком згаджаецца і далучаецца да рашэньняў ЦК і ЦКК.

Тав. **Карачэўскі**. У меўшыхся прарывах вінаваты ня толькі гарком, кіраўніцтва яго, але значная доля віны ўскладаецца на парткалектывы, ячэйкі і ўвесь партыйны актыў. Па перабудове партпрацы гаркомам мала што зроблена. Перабудова ў большасьці мясцох праходзіла фармальна і ніякіх вынікаў ад яе ня відаць. Нават і сход актыву бюро гаркому не адважыўся склікаць каб азнаёміць з сыстэмай перабудовы партыйнай працы. Гарком абмежаваўся друкаваньнем у газэце некалькіх артыкулаў, прычым ня зусім рэальных. Віцепартарганізацыя павінна засучыўшы рукавы зараз-жа ўзяцца за выпраўленьне дапушчаных ёю памылак, дабіцца чоткага і яснага кіраўніцтва на ўсіх вучастках працы.

Тав. **Разумаў**. Праца гарпрафсавету зусім ня спрыяла разгортваньню ўдарніцтва і сацспаборніцтва. Кіраўніцтва гарпрафсавету ня стала на чале гэтых сацыялістычных форм працы. Тав. Разумаў спыняе ўвагу актыву на рабоце зачыненых рабочых каапэратываў. Ён кажа, што тут мы маем скажэньне дырэктыў партыі. Чаргі павялічваюцца. Сталовыя працуюць дрэнна. У адносінах наладжваньня грамадзкага харчаваньня пералому належнага не дабіліся. Зараз праходзіць справаздачна-перавыбарчая кампанія бюро парт'ячэек і калектываў. Ці мабілізавана ў нас увага ўсёй партарганізацыі гораду на выкананьне стаячых у зьвязку з ёю задач? Не! Гарком у гэтых адносінах таксама праявіў апартуністычны самацёк. Прыкладна: на заводзе «Чырвоны мэталіст» большасьць партыйцаў ня прымаюць ніякага ўдзелу ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Віцебская партарганізацыя здаровая і з бальшавіцкім кіраўніцтвам яна здолее выканаць ускладзеныя на яе задачы.

Тав. **Рацэвіч** у сваім выступленьні спыняецца на партыйным кіраўніцтве камсамолам. Ён адзначае, што гэтае кіраўніцтва было яўна недастатковае і ні ў якім разе не забясьпечвала добрую працу камсамольскай арганізацыі ў разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Той факт, што па Віцебску ахоплена толькі 45 проц. камсамольцаў ударніцтвам гаворыць шмат аб чым. Зараз у камсамольскую арганізацыю прыходзіць такі сыры матар'ял, аррацаваць які бяз добрага партыйнага кіраўніцтва немагчыма.

Т **Цукерман**.—Сьнежанькі пленум ЦК адзначыў, што добрая праца гарсавету магчыма ў тым выпадку, калі ён будзе абапірацца на шырокія рабочыя масы. Што наш гарсавет у гэтых адносінах робіць? Дэпутацкія групы на большасьці прадпрыемстваў не працуюць, сэкцыі таксама ня могуць пахваліцца сваёй работай. Часта бываюць зрывы пасяджэньняў сэкцый з-за наяўкі членаў іх. Гарсавет часта займаўся дробязямі, зусім не зварочваючы ўвагі на вытворчыя пытаньні. Перабудова працы каапэрацыі прайшла міма гарсавету. Гарсавет пытаньнямі жыллёвага камунальнага будаўніцтва мала займаўся. На адказных вучастках працы ў гарсавеце адсутнічаюць кіраўнікі. Няма кіраўнікоў у плянавым і фінансавым аддзелах.

Тав. **Азарэнкава**.—У пастанове ЦК і ЦКК зусім правільна адзначана аб прарывах у нацыянальным пытаньні, прамфінпляне, разгортваньні самакрытыкі ў Віцебску. Тав. Азарэнкава адзначае, што перабудова масавай працы праведзена фармальна. Па шэфству над вёскай і ўстановай мы ня выканалі ускладзеных на нас задач. Перанясеньне вопыту прадпрыемстваў на вёску праходзіць слаба. Парткалектывы, ячэйкі, ФЗМК гэтым пытаньнем амаль не займаліся. Зараз наступіла праполачная кампанія ў прыгарадных гаспадарках. Калі ў веснавую сяўбы нейкая дапамога і была з боку прадпрыемстваў, дык зараз яе не адчуваецца. Спыняючыся на рабоце дэлегацкіх сходаў, т. Азарэнкава гаворыць, што з пачатку, у час перавыбараў дэлегацкіх сходаў яна ажывілася, але на сёньня застыла. Сакратары парткалектываў і ячэек ня ставілі пытаньне аб працы сярод работніц і дэлегацкія сходы мала дзе працуюць.

Тав. **Казлоў**.—Гарадзкі камітэт партыі займаўся тым, што штампаваў рэзалюцыі, выносіў іх, але зусім не займаўся праверкай выкананьня сваіх пастаноў. ЦО партыі Беларусі «Зьвязда» зусім правільна ставіла пытаньне аб памылках гаркому ў пытаньнях разгортваньня самакрытыкі, выкананьня прамфінпляну і нацпалітыкі. Замест рашучага выпраўленьня гэтых памылак гарком расьцяраўся, атрымалася «заседательская ліхаманка». Камсамольскія калектывы на асобных вучастках сваёй працы маюць прарывы. Слабы ахоп камсамольцаў і моладзі ўдарніцтвам і сацспаборніцтвам даволі гучна гаворыць аб гэтым.

Тав. Казлоў прыводзіць характэрны факт, калі гарком партыі ў расьцеранасьці вынес пастанову аб партыйным кіраўніцтве камсамолам без папярэдняга заслухоўваньня сэкратароў парткалектываў і гаркому камсамолу.

Тав. **Рэзьнікаў**.—Рашэньні ЦК і ЦКК па свайму глыбокаму палітычнаму зьместу маюць значэньне ня толькі для нас, але для ўсёй КП(б)Б. Мы ня справіліся з асноўнымі вузлавымі палітычна-гаспадарчымі заданьнямі.

Тав. **Гей** у сваёй прамове зусім правільна адзначыў, што ад віцебскай партарганізацыі, як адной з буйных, трэба больш патрабаваць. Дзе крыюцца прычыны ў невыкананьні прамфінпляну? Яны захаваны ў тым, што ня было дыферэнцыяванага падыходу да кіраўніцтва апэрацыйна-масавай работай. Мы не дабіліся таго, каб партыйцы, камсамольцы пагалоўна ўдзельнічалі ў сацспаборніцтве і ўдарніцтве. Гэта мы ня выканалі таму, што ў разгортваньні ўдарніцтва і сацспаборніцтва ня было належнага канкрэтнага кіраўніцтва, таму і былі выпадкі ігнараваньня гэтых форм. У перабудове партмасавай працы мы мелі апартуністычны самацёк і ў першую чаргу вінаваты ў гэтым аргаддзел гаркому партыі.

Мы маем самыя глыбокія прарывы ў правядзеньні нацыянальнай палітыкі. Пастанова ЦК і ЦКК зусім правільна адзначае гэта. Мы мелі факты яскравага заціску самакрытыкі, ігнараваньня некаторых кіруючых працаўнікоў узяць самакрытыку ў свае рукі. Гарком КП(б)Б ня граў арганізуючай ролі ў разгортваньні сапраўды бальшавіцкай самакрытыкі, гэтым самым аб'ектыўна тармозячы яе. Згуртаванасьць усёй партарганізацыі Віцебску на выпраўленьне памылак, правядзеньне ў жыцьцё пастаноў ЦК і ЦКК можа забясьпечыць далейшыя посьпехі ў рабоце нашай партарганізацыі.

Тав. **Рабімовіч** спыняецца на праблеме кадраў. Прарыў у гэтым стварыўся таму, што мы не рыхтавалі новых кадры.

У адзначаных ЦК і ЦКК прарывах, якія мелі месца ў Віцебску ў аўладаньні тэхнікай, партыйнай вучобе, правядзеньні нацпалітыкі вінаваты і культпроп. За беларусізацыю, за аўладаньне тэхнікай, за партвучобу адказвае ўвесь гарком, але ў першую ч а р г у культпроп. Мы ня здолелі цесна ўвязаць усе гэтыя пытаньні, а мая віна, як загадчыка культпропа, што я не сыгналізаваў аб гэтым своечасова. Мы маем зрыў партвучобы па віне фабкомаў, партыйных калектываў і ячэек. У рабоце культпропу быў апартуністычны самацёк. Прызнаньня ўсіх гэтых памылак мала. Патрэбна мабілізацыя ўсёй увагі на рашучае выпраўленьне іх.

Тав. **Лясковіч** кажа, што вылучэньне новага актыву тармазілася на самім-жа прадпрыемствах. Віцебская партарганізацыя здольна вырашчваць актыў ня толькі для сябе, але і для іншых гарадоў Беларусі.

Тав. **Чычэраў**.—Адной з асноўных прычын нашых памылак зьяўляецца тое, што мы, выносячы зусім правільна палітычна абаснаваныя пастановы, выкананьне іх не правералі. У нас надзвычайна дрэнна абстаіць справа з мабілізацыяй мас на ліквідацыю прарываў. Дрэнна з сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. У разгортваньні самакрытыкі ў самым гаркоме было шэраг прарываў. Былі моманты зацiску самакрытыкі. Далей т. **Чычэраў** спыняецца на рашэньнях ЦК і ЦКК і адзначае, што яны зусім правільна і своечасова паказалі памылкі віцебскай партарганізацыі. Мы маем глыбокі палітычны прарыў у правядзеньні нацпалітыкі. Маюцца факты, якія пацьвярджаюць недаацэнку нацыянальнага пытаньня некаторымі адказнымі працаўнікамі. Белмова ў штодзённай рабоце ўжываецца слаба. Маецца пасіўнае супраціўленьне вывучэньню і ўжываньню белмовы. На такім прадпрыемстве, як «Дзьвіна» дзе працуе большасьць беларусаў няма беларускага гуртка.

У нас маюцца прарывы і ў гэтым вінаваты ня толькі гарадзкі камітэт партыі але і ўвесь партыйны актыў. Зьмена на працягу зусім кароткага часу трэцяга кіраўніцтва гаворыць аб хваравітасьці партыйнага актыву.

Толькі дапамога ўсяго партыйнага актыву кіраўніцтву гарк... рашучая барацьба з прарывамі з...сьпечаць далейшыя посьпехі Віцебскай партарганізацыі. П...тыйны актыў і ўся партарганізацыя Віцебск... павінны па бальшавіцку ўзя... ...шучае выкарчоўваньне сваіх ... рашучую перабудову ўсёй па... на-масавай работы, пакла...ўшы ў ...нову сваёй далейшай работы рашэньні ЦК і ЦКК.

...рнікаў сацыялістычнага будаўніцтва ў рады ленінскай КП(б)Б

...станова ЦК КП(б)Б аб становішчы росту КП(б)Б у першым квартале 1931 г. (ад 16-га чэрвеня 1931 г.)

...хаўшы даклад аб росьце КП(б)Б ...ым квартале 1931 г., бюро ...(б)Б адзначае, што, ня гледзя... некатораe колькаснае павялі... складу КП(б)Б за першы ...л (на 2 630 чал.), павялічэньня прыёму ў партыю, су... IV кв. 1930 г. на 26,8 проц., ...а належнага пералому ў павя...ні тэмпаў росту за лік рабо...ад вытворчасьці яшчэ няма ...я ад вытворчасьці складалі ...е студзеня 40,5 проц., на ...асавіка—40,3 проц.).

...ег арганізацый не ўвязалі ў ...працы вялізарны ўздым актыў... ...шырокіх рабочых мас, уздым ...цка-серадняцкіх мас вёскі за ...лістычную перабудову сель...гаспадаркі з задачай павялі...я тэмпаў росту партыі за лік ...ых ударнікаў ад вытворчасьці, ...ых саўгасаў, батракоў і леп...калгасьнікаў. Па шэрагу буй...прамысловых арганізацый, як ...кай, Віцебскай, Гомельскай, ...кай, Барысаўскай процант ра... ад вытворчасьці на 1-га кра... 1931 г. нават і павізіўся.

...ат якімі арганізацыямі ня вы...а дырэктыва ЦК аб процант... ...забесьпячэньні ў агульным пры... партыю рабочых ад вытвор... сельгасрабочых і батракоў. ...недапушчальным і той факт, ...ў 33 раёнах (Асіпавіцкім, Жура...м, Крычаўскім, Камарынскім, ...слаўскім і інш.) ня прынята за першы квартал ніводнага сельгасрабочага і батрака.

ЦК лічыць зусім недапушчальным дальнейшае зьніжэньне па шэрагу арганізацый проценту камсамольцаў (па Менскай арганізацыі з 18,4 проц. на 1-га студзеня 1931 г. да 16,6 проц. на 1-га красавіка 1931 г., па Віцебскай—з 20,3 да 17,5 проц., па Гомельскай—з 12,5 проц. да 10 проц., Магілёўскай—з 19,5 проц. да 11,5 проц. і г. д.), што і прывяло да далейшага зьніжэньня проценту камсамольцаў у складзе КП(б)Б з 16 проц. на 1-га студзеня 1931 г. да 14,6 проц. на 1 га красавіка 1931 г.

Выходячы з гэтага ЦК катэгарычна прапануе гаркомам і райкомам дабіцца ў бліжэйшы час карэннага пералому ў падвышэньні тэмпаў росту партыі за лік рабочых-ударнікаў з вытворчасьці, сельгасрабочых і батракоў і лепшых калгасьнікаў, увязаўшы гэту задачу з далейшай мабілізацыяй рабочых на барацьбу за бальшавіцкія тэмпы сацбудаўніцтва, за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну і вырашэньне чарговых задач па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі (ўборка ўраджаю, калектывізацыя, асеньняя сяўба і правільная арганізацыя працы ў калгасах).

Адзначаючы рэзкае адставаньне тэмпаў росту партыі ў першым квартале па шэрагу буйнейшых прадпрыемстваў БССР (па швэйнай ф-цы «Камінтэрн» прынята ў партыю толькі 10 рабочых, заводу імя Ланцуцкага—25 рабочых, папяровай ф-цы «Спартак»—10 рабочых, папяровай ф-цы «Чырвоная Зорка»—11 рабочых, гуце «Ноўка»—14 рабочых, гуце «Пралетары»—7 рабочых, ільнапрадзільнай ф-цы «К. Маркса»—10 рабочых, папяровай ф-цы «Гэрой працы»—Добруш—16 рабочых, фанэрнай ф-цы «Чырвоны Кастрычнік»—13 рабочых), ЦК прапануе партыйным арганізацыям гэтых прадпрыемстваў і ставіць перад імі задачу значнага ўзмацненьня работы па вярбоўцы рабочых-ударнікаў у партыю. ГК і РК, па тэрыторыі якіх знаходзяцца гэтыя прадпрыемствы мець сваё штодзённае кіраўніцтва і назіраньне за ходам вярбоўкі ў ніх рабочых у партыю.

ЦК ставіць перад усімі партыйнымі арганізацыямі і ЦК ЛКСМБ, як адну з баявых задач—павялічэньне тэмпаў росту партыі за лік членаў ЛКСМБ—лепшых ударнікаў на вытворчасьці, даказаўшых на справе сваю адданасьць партыі ў барацьбе за бальшавіцкія тэмпы сацбудаўніцтва.

Нягледзячы на тое, што па шэрагу галін вытворчасьці ў БССР значна ідзе рост рабочае клясы на лік жанчын, процант жанчын у складзе КП(б)Б да гэтага часу застаецца яшчэ зусім нізкім (13 проц. на 1 е красавіка 1931 г.). ЦК прапануе партыйным арганізацыям пасіліць работу па ўцягненьні ў партыю работніц з вытворчасьці, сельгасработніц і батрачак і лепшых калгасьніц.

ЦК пацьвярджае ранейшую сваю пастанову аб процантным забесьпячэньні рабочых у складзе прыйманых у партыю і прапануе: а) райкомам, на тэрыторыі якіх маецца адно буйнае, альбо некалькі дробных прадпрыемстваў, забясьпечыць прыём па першай катэгорыі ня менш 60 проц.; б) раёны, на тэрыторыі якіх маюцца саўгасы, павінны мець у складзе прыймаемых па першай катэгорыі ня менш 40 проц.; в) раёны, на тэрыторыі якіх ня маюцца прадпрыемствы і саўгасы, павінны мець у складзе прыймаемых па першай катэгорыі ня менш як 30 проц.

Лічыць неабходным на працягу 2 га і 3 га кварталу 1931 г. заслухаць даклады некаторых ГК і РК прамысловых гарадоў і некалькі сельскіх РК аб становішчы росту і рэгуляваньні сацыяльнага складу партыі.

Катэгарычна прапанаваць ГК і РК паскорыць афармленьне прытоку ў партыю і ўзмацніць работу па пераводзе з кандыдатаў у члены партыі.

...енінградзкія рабочыя едуць у Сярэднюю Азію на ўборку бавоўны

Ленінградзе абласткомы ...рабочых бавоўнянай і ...набудаўнічай прамысло... прыступілі к адбору 100 ...ых, якія накіруюцца на ...цаў у падшэфныя раёны ...ай Азіі на ўборку бавоў... тэкстыльшчыкаў пасылаюцца галоўным чынам у калгасы на арганізацыю збору бавоўны. Машынабудаўнічыя кваліфікаваныя рабочыя адпраўляюцца ў МТС для рамонту ўборачнага інвэнтара. Ленінградзкія рабочыя ў Сярэднюю Азію выяжджаюць у ліпені.

...Пазыка па СССР рэалізавана на 841 млн. руб.

...ר אנערע ...ביילעכן אין ...ר שטאטקאס פון פארמיי ...זיך פארגינטערעסירן מיט דער אנ... ...רונג פון פארקאלעקטיוו.

...טאבארץ.

...ר ...ר ...ר ...ר

...ר ...ר ...ר ...ר

...ר ...ר ...ר ...ר

...ר ...ר ...ר ...ר

...ר ...ר ...ר ...ר

...ר ...ר ...ר ...ר

...ר ...ר ...ר ...ר

...ר ...ר ...ר ...ר

...ר ...ר ...ר ...ר

...

Сеньня у Віцебску адчыняецца зьлет ударнікаў-калгасьнікаў ільнаводчых раёнаў Беларусі

Намеціць разгорнутую праграму барацьбы за лён, забясьпечыць пасьпяховую прополку і падрыхтоўку да ўборкі лёну, стварыць базу для забесьпячэньня прамысловасьці сыравінай—баявыя задачы зьлёту

Дамо сацыялістычнай прамысловасьці лён

Сёньня ў Віцебску адкрываецца зьлёт ударнікаў брыгадзіраў ільнаводчаскіх калгасаў Беларусі. Задачы, якія стаяць перад зьлётам, надзвычайна адказныя і складаныя. Зьлёт павінен падвесьці вынікі вясновага севу, засеву лёну, абмеркаваць як лепш зьняць ураджай лёну, поўнасьцю выканаць пляны, дабіцца павялічэньня якасьці апрацоўкі. Гэты зьлёт павінен унесьці рашучы зрух у вырашэньні праблемы тэхкультур у нас на Беларусі.

Узрастаючая сацыялістычная прамысловасьць патрабуе поўнага забесьпячэньня яе сыравінай, адсюль вынікае неабходнасьць пашырэньня плошчы тэхкультур, поўнае выкананьне плянаў ня толькі засеву, а больш адказнай працы—уборкі яго.

Галоўнымі фактарамі, роля якіх адна з адказнейшых у вырашэньні тэхкультур, зьяўляюцца буйныя калгасы і саўгасы. Яны зьяўляюцца асноўным сродкам вырашэньня праблемы тэхкультур. Сацыялістычны сэктар адказны за забесьпячэньне нашай прамысловасьці ільносыравінай.

Вось чаму адкрываючыся сёньня міжраённы зьлёт ударнікаў-калгасьнікаў ільнаводчых раёнаў Беларусі павінен з асаблівай вастратой і сур'ёзнасьцю падыйсьці да вырашэньня задач, якія ўскладзены на калгасы—вырашэньня праблемы тэхкультур. Дабіўшыся посьпехаў у выкананьні і перавыкананьні плянаў па засеву лёну, перад намі паўстала больш адказная праца—зьняць гэты ўраджай.

Далейшае пашырэньне плошчы пад тэхнічныя культуры, узьняцьце ўраджайнасьці і якасьці лёну магчымы пры ўмове мэханізацыі ільноапрацоўкі. У гэтым годзе ў БССР пабудавана 46 ільноапрацоўчых заводаў, але мы яшчэ на сёньня ня можам поўнасьцю забясьпечыць усе калгасы ільноапрацоўчымі машынамі. Прыдзецца яшчэ ў гэтым годзе значнай частцы калгасаў працаваць ручным спосабам. Гэта яшчэ больш ускладае на калгасы і калгасьнікаў адказьнейшыя задачы. Зусім зразумела, што тут пытаньне ўпіраецца ў правільную арганізацыю працы, чоткую расстаноўку сіл, арганізацыю ўліку работ, правядзеньне зьдзельшчыны.

Моманты апартуністычных адносін да вырашэньня праблемы тэхкультур яшчэ сустракаюцца. Мы маем імкненьне некаторых працаўнікоў раёнаў скараціць пляны засеву лёну, маем факты апартуністычнай недаацэнкі забясьпечаньня сацыялістычнай прамысловасьці лёнам. Апартуністычныя памылкі і скажэньні павінны быць зараз-жа выпраўлены. Прыклады перадавых раёнаў, якія з посьпехам перавыканалі свае пляны, павінны быць падхоплены астатнімі.

Адказная роля ў барацьбе за якасьць лёну ўскладаецца на МТС і саўгасы. Задача партыйных, камсамольскіх і грамадзкіх арганізацый, шырока ўжываючы сацыялістычныя формы працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва, штодзённа змагацца ня толькі за колькасныя паказальнікі, але і за якасныя.

Гістарычная адозва ЦК УсеКП(б) аб кантрактацыі ні на хвіліну не павінна выйсьці з-пад увагі. Трэба памятаць, што кантрактацыя забясьпечвае ня толькі вырашэньне тэхнічных культур, але зьяўляецца магутным вагаром калектывізацыі.

Зьлёт павінен па-дзелавому абгаварыць усе гэтыя пытаньні, зьвязаныя з пасьпяховым вырашэньнем праблемы тэхнічных культур, намеціць далейшыя пэрспэктывы для выкананьня задач партыі ў забясьпечаньні прамысловасьці—ільносыравінай.

Зьлёт перадавікоў калгасаў, абгаварыўшы свае посьпехі, дасьць разгорнутую праграму бальшавіцкіх дзеяў на калгасных палёх у вырашэньні праблемы тэхнічных культур.

Поўнасьцю забясьпечым прамысловасьць сыравінай

Міжраённаму зьлёту калгасьнікаў ільнаводчых раёнаў Беларусі

РАПАРТ

Па Віцебскаму раёну на 25 чэрвеня засеяна ільну па калгасах і аднаасобным сэктары 1226 га, што складае 113 проц. выкананьня плянавага заданьня. Пасеўная плошча ільну 1930 г. перавышана на 341 га ці на 38 проц.

Упераздзе ідуць калгасы. Яны выканалі плян сяўбы тэхнічных культур на 135 проц., аднаасобны сэктар сваё заданьне выканаў на 94,4 проц. Сяўба ільну павінна скончыцца 1-га ліпеня.

Пад правільным кіраўніцтвам партыі і яе ленінскага ЦК працягваем барацьбу за арганізацыю прополкі, за бальшавіцкую падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі. Наш абавязак па забесьпячэньні сацыялістычнай прамысловасьці ільносыравінай мы поўнасьцю выканаем.

Віцгарсавет.
Віцгарпрафсавет.

Дапамагчы адстаючым

На 30-е чэрвеня па Віцебскаму раёну плян кантрактацыі тэхнічных культур лёну і канаплі выкананы на 104,9 проц. Па заданьню патрэбна было засеяць 825 га, а засеяна 865,59 га. Канаплі па ўсім раёне засеяна толькі 13,5 га, бо пляны, складзеныя каапсаюзам, засеву канаплі зусім не прадугледжвалі. Рудніцкі сельсавет выканаў плян засеву лёну на 133,1 проц., Даўжанскі сельсавет на 139,3%, Шумнянскі на 122,7 проц., Бабініцкі на 121 проц., Старасельскі на 108 проц.

Ганебна адстаюць: Віцебскі сельсавет, які на 30-е чэрвеня выканаў плян засеву лёну толькі на 44 проц., Ялагінскі—на 59, Міхалёўскі—на 65,5, В Лётчанскі—70,6, Сялюцкі—93 проц. і г. д. Гэтыя лічбы яскрава гавораць аб бязьдзейнасьці гэтых сельсаветаў, якія ня выканалі плянаў і нічога ня прадпрымаюць для таго, каб ліквідаваць ганебны прарыў.

Райкаапсаюз недастаткова зьвярнуў увагу на тыя сельсаветы, якія недавыканалі пляны, каб дапамагчы ім выканаць заданьне. Апошні час райкаапсаюз зусім не вядзе працы ў бок выкананьня плянаў. Зараз, калі большасьць лёну высеяна і частка яго не закантрактавана, дык райкаапсаюзу неабходна павесьці працу па кантрактацыі на корні ў тых калгасах і аднаасобных гаспадарках, якія высеялі лён у вялікай колькасьці і не закантрактавалі яго.

Райкаапсаюз і ўсе грамадзкія арганізацыі павінны павесьці растлумачальную працу сярод калгасаў і аднаасобнікаў аб кантрактацыі пасеву лёну на корані і своечасова даць адпаведныя паказаньні па догляду за лёнам, прополцы і інш. Райкаапсаюз павінен зараз-жа распачаць працу па забясьпечаньню ўборачнымі машынамі гаспадарак, дзе праведзена кантрактацыя.

Х—и.

Змагары сацыялістычных палёў перавыканалі пляны пасеву ільну

У трэцім рашаючым годзе рабочая кляса, разам з працоўным сялянствам, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, дабілася вялізарнейшых посьпехаў у галіне разьвіцьця прамысловасьці і калектывізацыі вёскі.

Па Віцебскаму раёну на 25-е чэрвеня калектывізавана 62 проц. бядняцка серадняцкіх гаспадарак. Малады калгасы сапраўды ўзброіліся бальшавіцкімі тэмпамі і дабіліся выкананьня пляну засеву ільну на 135%, засеяўшы 671 га.

Калгас імя 1 га мая, Старасельскага сельсавету, дзякуючы ўдарнай працы калгасьнікаў, засеяў 50 га пад лён замест прадугледжаных па пляну 31 га, што складае 161,3 проц.

Калгас імя Дзяржынскага, Рудніцкага сельсавету, засеяў ільну 28 га замест 13 га, што складае 215,3 проц. пляну.

Калгас імя Молатава, Бабініцкага сельсавету, арганізаваўшыся ўвясну 1931 г., таксама перавыканаў плян засеву ільну, замест **30 га** засеяў 42 га.

Калгас, «Зьвязда», Сялюцкага сельсавету, выканаў плян засеву ільну на 190,9 проц., замест 11 га пасеяна 21 га.

Калгас імя Войкава, Рудніцкага сельсавету, перавыканаў плян засеву ільну на 8 га., замест 10 га пасеяна 18 ці 180 проц. пляну.

Калгас імя тав. Сталіна, Рудакоўскага сельсавету, засеяў ільну 20 га, замест прадугледжаных па пляну 13 га.

Калгас «Прагрэс», віцебскага сельсавету, выканаў плян пасеву ільну на 187,5 проц.

Калгас «Чухвары», рудакоўскага сельсавету, выканаў плян засеву на 175 проц Замест 8 га па пляну засеяна 14 га.

Калгас «Шлях Леніна», міхалеўскага сельсавету, арганізаваўшыся ўвясну 1930 г. з пяці гаспадарак, дакацца другой бальшавіцкай вясны ўзрос да 35 гаспадарак, перавыканаўшы плян засеву ільну на 5 га. Замест 7 засеяна 12 га.

Калгас «Інтэрнацыянал», даўжанскага сельсавету, пасеяў ільну 15 га, замест 12 па пляну.

Калгас «Чырвоны пахар», міхалеўскага сельсавету, арганізаваўшыся ў пачатку вясновага севу 1931 г., выканаў плян засеву ільну на 166 проц., успахаўшы і забаранаваўшы папарныя палі і пачаўшы ўборку сена.

Калгас «Шлях да сацыялізму», таго ж сельсавету, поўнасьцю выканаў плян засеву ільну.

Гэтыя вялікія перамогі па засеву ільну павінны мабілізаваць масы калгасьнікаў, калгасьніц, каб яшчэ больш узброіўшыся бальшавіцкамі тэмпамі і настойлівасьцю, накіраваць усе сілы на поўную ўборку засеянага ільну. Неабходна дабіцца замацаваньня гэтых перамог і безадкладна пераключыцца на своечасовую прополку ільну і падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі. Трэба раз назаўсёды памятаць, што толькі добры дагляд за пасевам, своечасовая ўборка вырашаюць якасны і колькасны ўраджай. Сёньняшні міжраённы зьезд калгасьнікаў ільнаводаў павінен падвесьці вынікі сяўбы другой бальшавіцкай вясны і мабілізаваць увагу шырокіх мас калгасьнікаў на правільную расстаноўку сіл, правільны падлік працы, увядзеньне зьдзельшчыны, ацэненай у працаднёх.

Фронт уборкі патрабуе яшчэ больш напружаных сіл, чымся сяўба, а таму трэба мабілізаваць усю энэргію мас калгасьнікаў разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж калгасамі, брыгадамі і групамі, каб дабіцца поўнага выкананьня плянаў уборкі.

С.

ТЭЛЕФОНАГРАМА

ПЯЦІДЗЕНЬНІК ШТУРМУ ПРАПОЛКІ ГАРОДАЎ І ЛЕНУ

Усім сакратарам парткалектываў і ячэек КП(б)Б, старшыням ФЗМК

Парткалектывы, ФЗМК ня выконваюць рашэньняў гаркому аб мабілізацыі і пасылцы рабочых на прополачныя работы ў прыгарадныя гаспадаркі, з-за чаго пасевы ў прыгарадных гаспадарках гінуць, што зьяўляецца агіднымі адносінамі да вялікай палітычна-гаспадарчай задачы. Неабходны тэрміновыя і рашучыя захады па пасылцы рабсілы ў бліжэйшыя 2—3 дні, каб выратаваць пасевы ў прыгарадных гаспадарках.

Гарком партыі, гарпрафсавет, гарсавет абвяшчаюць пяцідзённику (з 30-га чэрвеня па 5-е ліпеня) штурму прополкі гародаў і лёну ў прыгарадных гаспадарках, калгасах і саўгасах.

Гарком партыі катэгарычна прапануе пад асабістую адказнасьць сакратароў парткалектываў, ячэек КП(б)Б і старшынь ФЗМК прымаць усе неабходныя захады, дабіцца масавага выхаду рабочых і работніц згодна раней дадзеных лічбаў, усіх навучальных устаноў і піанэраў старшага ўзросту на прополачную работу ў прыгарадныя гаспадаркі.

Парткалектывам і ячэйкам КП(б)Б гораду штодзённа паведамляць гарпрафсавет аб колькасьці выхадаў на работу.

Сельскім ячэйкам КП(б)Б па скончэньні тыдня штурму паведамляць ГК КП(б)Б аб вынніках, а сельсаветам паведамляць аб зьніках скончэньня тыдня штурму гарсавету.

Гарком КП(б)Б.
Гарпрафсавет.
Гарсавет.

Рашуча падцягнуць адст чыя вучасткі падпіск

РАБОЧЫЯ ГОРАДУ, СЬЛЕДУЙЦЕ ПРЫКЛАДУ НЫХ БАЙЦОЎ Н-скага ПАЛКУ, ПЕРАВЫКАНАЎШ ДАНЬНЕ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ „3-га РАШ

Будаўнікі, прымеце выклік вашых шэфных

Зварот чырвонаармейцаў і начскладу №-скага стрэлковага Віце ўдарнага палку да рабочых будаўнікоў Віцебскага раёну

Таварышы! Да нас, чырвонаармейцаў і камандзіраў вашага падшэфнага палка, дайшлі дрэнныя зьвесткі, што вы адсталі ў тэмпе падпіскі на пазыку «Трэцяга рашаючага году пяцігодкі» ад перадавікоў віцебскага пралетарыяту, а тым больш ад перадавога атраду рабочае клясы—рабочых Масквы і Ленінграда.

Мы, чырвонаармейцы і камандзіры, добра бачым і адчуваем посьпехі нашай пяцігодкі, посьпехі нашага сацыялістычнага будаўніцтва, мы добра ведаем, што ўся міжнародная буржуазія і іх падгалосьнікі ўнутры СССР—кулакі і непманы ўсе сілы кладуць каб перашкодзіць нашым посьпехам, каб спэкуляваць на нашых цяжкасьцях, паслабляць волю працоўных да хутчэйшай пабудовы сацыялізму, адзінай сыстэмай гаспадаркі, здольнай сапраўды ўзьняць на нябывалую вышыню матар'яльны, культурны і палітычны ўзровень працоўных.

Мы ўсялякі раз у адказ на работу варожых элементаў, яшчэ больш павышаем тэмпы баявой падрыхтоўкі, яшчэ больш згуртоўваемся вакол генэральнай лініі партыі і яе ленінскага ЦК на чале з т. Сталіным.

Мы сотні лепшых ударнікаў давалі і даём у партыю, мы неадкладна адгукнуліся на заклік ураду даць у пазыку дзяржаве нашы вольныя сродкі на разьвіцьцё н сацыялістычнае гаспадаркі. Мы на „Пяцігодка—у чатыры гады“ далі 24.00 на пазыку „3 га рашаючага году“ за а каду далі 35 000 руб. Толькі адны чыр мейцы, якія атрымоўваюць па 1 р. 45 к сяц, далі каля 20 000 руб. (у сярэднім н нага па 15—20 руб). Камандзіры да 15.000 руб. (у сярэднім кожны па поўн сячнаму заробку) Шмат чырвонаармейц пісаліся па 50—70 руб. Шмат камандзір пісаліся на паўтарамесячны заробак. П працягваецца.

Таварышы, рабочыя цагельных за будаўнікі!

Няўжо вы адстанеце ад сваіх пад шэ Не, вы наш заклік падхопіце, дружна цеся за падпіску на пазыку. Мы выклік на сацспаборніцтва на 100-процантны ах рабочых і чырвонаармейцаў падпіскай н ку „3 га рашаючага году“, ня менш месячны заробак.

Да 5 га ліпеня выканаць гэтыя а цельствы.

Мы ў сваю чаргу, арганізуем дада падпіску на пазыку «3-ці рашаючы г цігодкі».

Шкодным разважаньням даць адпор

6-м групкомам пры пабудове новай панчошна-трыкатажнай фабрыкі, які аб'яднае пабудовы элеватара і сталовай ЦРК, шырокай растлумачальнай работы аб значэньні новай пазыкі не разгорнута, у выніку гэтага пазыкай ахоплены толькі 50 проц. рабочых.

Бязьдзейнасьць групкому скарыстоўваюць **варожыя элементы** і праводзяць сваю **шкодную работу** супроць разьмяшчэньня пазыкі. Так **Адкідач**, які вылучан зборшчыкам па цэху, **работы не вядзе** і заяўляе, што «гэта насільле, голадам томяць, а на пазыку падпісвайся». На пабудовах маецца група бэтоншчыкаў, на чале якой стаіць **Бендз**, яўна варожы, **антысавецкі элемэнт**, які навучае групу адмаўляцца ад падпіскі на пазыку. Прапанова групкому распусьціць гэтую групу ня выканана. Бендз асобных рабочых сваёй групы настроіў так, што яны выступаюць з заявамі: «нам вашы пазыкі непатрэбны. Мінулыя пазыкі прапалі і зараз няма дуракоў». Бендзе дапамагае і другі антысавецкі тып—**Радэ**, які кажа: «калі няма грошай, ня трэба будаваць».

Парт'ячэйка, знаходзячыся на месцы, як і групком, нічога ня робіць.

Трэба ўзмацніць тэмпы падпіскі сярод рабочых 6-га групкому.

Шкоднікам, якія сваёй агіднай дзейнасьцю імкнуцца сарваць разьмяшчэньне пазыкі, трэба даць руйнуючы адпор і прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Вока.

Супроць цяганіны ў мленьні пазыкі

Пасяджаньнем бюро РСІ, якое адбылося 18 г. г., устаноўлена, што **касы ашчаднасьці Маркаў** назіралася **цяганіна** ў аблігацый пазыкі „Пяці чатыры гады“, што зьяў падрывам у распаўсюд дзяржаўных пазык. Нек рабочыя, як, напрыклад доўскі, дагэтуль не а свае аблігацыі. Бюро пастанавіла работнікам ашчаднасьці т.т. **Рыко і еву абвясьціць суровую з папярэджваньнем** праз Фабкому і камсодам п вана пэрыядычна правяр дачы аблігацый па дав ашчадкасе выдаць тэрмі затрыманыя аблігацыі ра пазык.

Выклікаем на сацспаборніцтва

Рабочыя кравецкай майстэрні т ва «Прыхільніы дзяцей» рэалізавалі пазыку „Трэці рашаючы год“, ахапіўшы 100 проц. рабочых падпіскай, з іх 30 проц. падпісаліся звыш месячнага заробку, 50 проц.—на месячны заробак і 20 —на 3 тыднёвы заробак.

Першым па разьмяшчэньні пазыкі ідзе закройны цэх, дзе рабочыя падпісаліся на 100 і 110 проц. свайго месячнага заробку. Старшы закройшчык **Розан** падпісаўся на 250 р. пры месячным заробку 150 р., тав. **Вульфсон** падпісаўся на 300 р. пры месячным заробку 180 р. Ён зьяўляецца лепшым ініцыятарам і ўдарнікам па рэалізацыі пазыкі. Лепшы ударнік камсамольскай брыгады тав. **Фурман** падпісаўся на 200 проц. свайго месячнага заробку, тав. **Сінельнікава** падпісалася на 300 р. пры месячным заробку 180 р., тав **Бодхан** на 300 р. пры месячным заробку 180 р., **Талуенка** на 225 р. пры месячным заробку 130 р., тав **Бляхман** на 220 р. пры месячным заробку 160 р., **Фэйгін**—на 100 р. пры месячным заробк **Рабкова**—на 115 р. пры месячным заробк **Жэрабовіч** і **Тамашоў** кожны па 180 р. сячным заробку 140 р., тав. **Мілюкоў** на пры месячным заробку 170 р., тав. **Віт** 200 р. пры месячным заробку 170 р. і т вянаў — 125 руб. пры месячным заробк рублёў.

Ёсьць і такія рабочыя, якія не ж падпісацца, але рабочыя аказваюць уплыў. Так, прыкладна, тав. **Райдштэ** спачатку адмовіўся, падпісаўся на 10 свайго заробку.

Рабочыя выклікаюць на сацспабо ф-ку «**Сьцяг Індустрыялізацыі**“, панчош катажную фабрыку імя Клары Цэткін прадпрыемствы т-ва «Прыхільнікі дзяце поўны і тэрміновы аход падпіскай усіх пісаўшыхся.

Фэ

Працоўныя Межаншчыны абяцаюць заданьне выканаць у тэрмін

Працоўныя Межаншчыны сустрэлі пастанову ўраду аб выпуску пазыкі „Тоэці рашаючы год пяцігодкі“ масавым прывітаньнем.

Работа па рэалізацыі пазыкі ў раёне разгортваецца. Рабочыя і служачыя раённых і сельскіх устаноў падпісаліся на пазыку на **100—120 проц. месячнага заробку**. Пазыка разьмешчана на **16 тысяч руб.**

Кампанія па рэалізацыі сярод сялян праходзіць пад лёзунгам „Калгасьнікі і аднаасобнікі—трохтыднёвы заробак на пазыку“.

Дадзенае па раёну заданьне **138 тысяч руб. працоўныя Межаншчыны абяцаюць палкам выканаць і ў тэрмін.**

Межанец.

Вучні дарбудвуча не адстаюц

Вучні школы дарбудвуча, сьледуючы прыкладу перадавых рабочых, пастанавілі падпісацца на пазыку ня менш поўнага месячнага заробку. Падпісаліся: **тт. Карнішоў, Смольскі, Уласенка, Гельман, Талу Градзюшка на 200 проц., кін, Маровава, Шапіра наў, Брахноў і Пэўн 166 проц.**, 116, 125 і 13

Ан.

12.855

Калектыў фабзавучу краўцоў рэалізаваў новую пазыку на суму 12 855 руб. Асобныя вучні падпісаліся больш чым на месячны заробак. Камсамольцы, **Лік і Шчокіна** не падпісаліся на пазыку. Да такіх камсамольцаў трэба прыняць рашучыя меры. Сярод калектыву неабходна ўзмацніць растлумачальна выхаваўчую работу па тэрміновым сканчэньні падпіскі на новую пазыку.

